

# Ветразі мары

**Прадстаўнікі актыўнай і здольнай моладзі з усёй Беларусі збяруцца сёння ў сталіцы на рэспубліканскім свяце выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі. Яго ўдзельнікамі стануць тры тысячы студэнтаў, якія дасягнулі высокіх вынікаў у вучобе, грамадскай і культурнай дзейнасці, спорце.**

Мерапрыемства пад адкрытым небам пройдзе на пляцоўцы каля Палаца спорту. Сцэна на беразе Свіслачы нагадвае прыстань, што арганічна ўпісваецца ў канцэпт фэсту, сімвалам якога сталі "Ветразі мары". Для гасцей прадугледжана інтэрактыўная праграма і канцэрт з удзелам зорак беларускай і замежнай эстрады. Арганізатары падрыхтавалі для выпускнікоў шмат падарункаў, адным з якіх стане выступленне Клавы Кокі.

— Мы прыслухаліся да ўсіх пажаданняў моладзі, правялі апытанне сярод студэнтаў, каб выбраць сапраўды папулярныя песні. Прагучаць як асобныя кампазіцыі, так і папуры з хітоў. Мы таксама падрыхтавалі масавы танцавальны флэшмоб і спадзяемся разам з выпускнікамі ўстанавіць рэкорд па колькасці ўдзельнікаў, — адзначае галоўны рэжысёр мерапрыемства Уладзіслава Арцюкоўская.

Кульмінацыяй свята стане воднае шоу: па Свіслачы праплыве карабель з пунсовымі ветразямі, якія сімвалізуюць надзеі і мары выпускнікоў. У канцы праграмы прысутных чакаюць грандыёзны феерверк і традыцыйная сустрэча світання.